“Зацвярджаю”
Дырэктар УК ГДГАМ
___________ Ю.В.Кітурка
1 лістапада 2021 г.

**Правілы наведвання**
**экспазіцыі Старога замка**

1. **Агульныя палажэнні**

1.1. Дадзеныя правілы накіраваны на забеспячэнне грамадскага парадку і бяспекі пры наведванні экспазіцыі Старога замка, паляпшэнне абслугоўвання наведвальнікаў і з’яўляюцца абавязковымі да выканання супрацоўнікамі музея і ўсімі асобамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Старога замка.
1.2. Для наведвання экспазіцыі Старога замка наведвальнікі павінны аплаціць кошт уваходных квіткоў праз касу і прад’явіць дакумент аб аплаце музейнаму дазорцу, які здзяйсняе кантроль.
1.3. Двор Старога замка і аглядная пляцоўка даступныя для наведвальнікаў, якія набылі білеты ў экспазіцыю Старога замка.
1.4. Продаж уваходных білетаў касай спыняецца за 1 гадзіну да закрыцця музея.
1.5. Арганізаванае наведванне экспазіцыі Старога замка прадугледжана групай у колькасці не больш за 10 чалавек.
1.6. Экскурсіі ў Старым замку праводзяць толькі штатныя навуковыя супрацоўнікі.
1.7. Каса можа часова спыніць продаж білетаў і ўваход наведвальнікаў у музей у выпадку высокай напаўняльнасці экспазіцыйных залаў, галерэі і іншых зон, а таксама адсутнасці свабодных месцаў у гардэробе ў халодны перыяд, аб чым будзе вывешваецца аб’ява на ўваходзе ў касу. Абслугоўванне замоўленых арганізаваных груп у такіх выпадках здзяйсняецца згодна запісу.

2. **Правы і абавязкі музея**

2.1. Паслуга экскурсійнага абслугоўвання наведвальнікаў прадастаўляецца па папярэдняй замове і аплаце дадзенай паслугі. Экскурсійнае абслугоўванне без папярэдняй замовы музей прадастаўляе пры наяўнасці вольных навуковых супрацоўнікаў.
2.2. Музей мае права змяніць час працы экспазіцыі, абмежаваць доступ у асобныя залы, інфармацыя аб чым змяшчаецца на касе музея і папярэдне на старонцы музея ў інтэрнэце.
2.3. Музей прадастаўляе адзін дзень у месяц для бясплатнага наведвання экспазіцый – апошні аўторак месяца. Дзень бясплатнага наведвання можа

пераносіцца на іншы дзень месяца, інфармацыя аб чым змяшчаецца на касе музея.
2.4. Гардэроб музея працуе ў халодны перыяд (з 15 кастрычніка па 14 красавіка). Камера захоўвання ў Старым замку адсутнічае.
2.5. Супрацоўнік гардэроба не нясе адказнасці за маёмасць (грошы, дакументы, тэлефоны, ключы і інш.), пакінутую ў кішэнях верхняй вопраткі.
2.6. Супрацоўнікі музея не здзяйсняюць нагляд і дагляд за дзецьмі, незалежна ад іх узросту. Уся адказнасць за дагляд і бяспеку дзяцей ляжыць на суправаджаючым.

## 3. Правы і абавязкі наведвальнікаў

3.1. Асобы, якія маюць права на льготнае наведванне музея, павінны прад'явіць касіру дакументы, якія пацвярджаюць права на атрыманне льгот.
3.2. Наведвальнікі, якія маюць права бясплатнага наведвання музея, і таксама ў дзень вольнага наведвання музея, павінны атрымаць у касе білет для бясплатнага наведвання.
3.3. Пры наведванні Старога замка з дзецьмі да 3 гадоў наведвальнікі могуць выкарыстоўваць прагулачную каляску, але музей пакідае за сабой права абмяжоўваць праход з каляскай пры высокай напаўняльнасці экспазіцыйных залаў і пераходаў паміж заламі. Спецыяльна адведзенае месца для часовага захоўвання дзіцячых калясак у музеі не прадугледжана. За дзіцячую каляску, пакінутую на тэрыторыі двара Старога замка, музей адказнасці не нясе.
3.4. Маламабільныя наведвальнікі і наведвальнікі з абмежаванымі магчымасцямі наведваюць экспазіцыю Старога замка з суправаджаючымі асобамі.
3.5. Забаронена прыводзіць і прыносіць з сабой любых жывёл, птушак, рэптылій і іншых прадстаўнікоў фаўны незалежна ад іх памераў.
3.6. Наведвальнікам дазваляецца праводзіць на тэрыторыі Старога замка аматарскія фота- і відэаздымкі ў асабістых (некамерцыйных) мэтах.
3.7. Забаронена распіваць ваду і іншыя напоі, ужываць ежу ў экспазіцыйных залах Старога замка.
3.8. Забаронена прыносіць і перасоўвацца на тэрыторыі Старога замка на самакатах, веласіпедах, ролікавых каньках, дошках, гіраскутэрах і іншых падобных транспартных сродках.
3.9. Падчас наведвання эспазіцыі забаронена кранаць рукамі экспанаты і вітрыны (акрамя інтэрактыўных вітрын і інфакіёскаў), садзіцца на музейныя экспанаты, абапірацца на падаконнікі і пастаменты, элементы інтэр'ера, псаваць і зрываць этыкеткі, інфармацыйныя стэнды і ўказальнікі, пакідаць надпісы на сценах і экспазіцыйнай мэблі.
3.10. Наведвальнікам і староннім асобам забаронена заходзіць за ўстаноўленую агароджу, самавольна прабірацца ў службовыя і тэхнічныя памяшканні, у іншыя памяшканні і тэрыторыю, закрытыя для наведвання.

3.11. Наведвальнікам і староннім асобам забаронена знаходзіцца на тэрыторыі Старога замка пасля яго закрыцця з 18.00 да 10.00 і ў непрацоўныя дні.
3.12. Для наведвальнікаў, якія парушылі правілы наведвання Старога замка, наведванне музея будзе спынена без звароту білетаў і грашовых сродкаў.
3.13. Наведвальнікі, якія нанеслі шкоду або матэрыяльную страту музею, могуць быць прыцягнуты да адміністрацыйнай ці крымінальнай адказнасці згодна дзеючаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь.